Источник: **«Літаратура і мастацтва» - 2012-06-01**

# Слова краязнаўцы



**Віталіна Сайфутдзінава, старшы навуковы супрацоўнік аб'яднанага краязнаўчага музея аддзела культуры Мазырскага райвыканкама, распавядае пра праект "Шляхамі А.К.Сержпутоўскага":**

Адным з аспектаў працы мясцовых краязнаўцаў з'яўляецца вывучэнне Мазыршчыны. Хацелася б звярнуць увагу на адзін з напрамкаў, які падаецца найбольш істотным. Яшчэ ў 2002 годзе мы распрацавалі праект этнакультурнага вывучэння Мазыршчыны "Шляхамі А. К. Сержпутоўскага". Назва невыпадковая: як вядома, знакаміты беларускі этнограф настаўнічаў у Мазырскім павеце, даследаваў Палессе, якое апісаў у нарысе "Беларусы-палешукі". Нездарма адной з інфармацыйных крыніц стварэння музея народнай культуры Мазыршчыны "Палеская веда" стала кніга Сержпутоўскага "Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў", у якой знайшла адлюстраванне традыцыйная культура палешукоў, іх светаўспрыманне, стаўленне да жыцця, міфалогія. Узнікла ідэя пабываць у тых мясцінах, дзе быў Сержпутоўскі, сабраць матэрыял, які захаваўся, а таксама працягнуць справу даследчыка.

Перыядычна мы разам з супрацоўнікамі Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі і Універсітэта культуры і мастацтваў арганізоўваем этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя куткі Мазыршчыны. За гэты перыяд пабывалі ў вёсках Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Мазырскага і Петрыкаўскага раёнаў. Пасля кожнай экспедыцыі ў музеі "Палеская веда" праходзіць справаздачная выстаўка.

Апошнім часам усё большае значэнне ў нашай працы пачынае набываць пытанне: як захаваць нематэрыяльную спадчыну? Згадзіцеся, прадметы матэрыяльнай культуры ў значнай ступені сабраныя, іх можна ўбачыць, узяць у рукі. А вось тыя ж самыя абрады, песні, танцы, рамёствы могуць адысці ў нябыт разам са сваімі нешматлікімі носьбітамі. Таму цяпер асаблівая ўвага надаецца працы па вывучэнні нематэрыяльнай культурнай спадчыны, сродкаў захавання і перадачы наступным пакаленням культурнага вопыту нашых продкаў.

Віталіна Сайфутзінава. Слова краязнаўцы